**Алена Міхалевіч**

## Стылістычная апраўданасць ужывання параўнанняў у паэме Якуба Коласа «Новая зямля»

Далёка за межамі Беларусі вядома імя Якуба Коласа (Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча) – паэта, празаіка, драматурга, філосафа, лінгвіста, літаратуразнаўцы. І сёння ўвагу чытачоў розных узростаў прыцягвае яго творчая спадчына, у якой асаблівае месца займае паэма «Новая зямля». Ствараючы гэты выдатнейшы твор беларускай літаратуры, дзе « … усё ўбачана, ацэнена вачамі, розумам, светаадчуваннем селяніна» [2, с.66], Якуб Колас старанна працаваў над падборам моўна-выяўленчых сродкаў і праявіў сябе як вопытны стыліст. Сведчаннем таму выступае, напрыклад, стылістычна апраўданае ўжыванне ў паэме канструкцый з параўнаннямі – слоў, словазлучэнняў і сказаў, якія шляхам параўнання раскрываюць змест іншых слоў сказа і служаць для дакладнай і вобразнай характарыстыкі прадметаў і з’яў навакольнага свету. Параўнанне звычайна заснавана на супастаўленні двух кампанентаў (аб’екта і суб’екта параўнання) па іх пэўным падабенстве і выконвае важныя стылістычныя функцыі. Так, у сказе *Стары ляснічы па-сваему // Цаніў Міхала, як служаку: // Ганяў усюды небараку, // Як бы скаціну тую нему* [1, с.28] за кошт параўнання *як бы скаціну тую нему* выразна акрэсліваюцца адносіны ляснічага да Міхала.

У залежнасці ад сродкаў сувязі параўнанні падзяляюцца на злучнікавыя і бяззлучнікавыя. Найбольшае пашырэнне ў аўтарскай мове паэмы атрымалі злучнікавыя параўнанні. Такія звароты ўводзяцца ў сказ пры дапамозе злучнікаў бы, быццам, нібы, нібыта, чым, што, як, як бы, як быццам і інш. Злучнікі пры гэтым выконваюць ролю фармальнага паказчыка вобразнага сродку і выражаюць пэўныя сэнсава-граматычныя адносіны паміж суб’ектам і аб’ектам. Так, параўнанні са злучнікамі *як, як бы* выражаюць супастаўленне суб’екта і аб’екта на аснове сцвярджальнага характару іх падабенства, г.зн. катэгарычнасць яго не выклікае сумнення ў свядомасці чытача: *Ўсе варушыліся, спявалі, // Як бы мурашнік раскапалі - // Такая тут была трывога* [1, с.38]. У параўнаннях са злучнікам *бы (нібы)* выразна не выяўляецца катэгарычнасць падабенства. Яна выражаецца з адценнем меркавання: *Садок быў, праўда, невялічкі: // Дзве верабіны ды тры дзічкі // Ды між верб ліпка маладая, // Бы іх унучка дарагая* [1, с.8].

Якуб Колас размяшчае параўнальныя звароты як у пачатку, так і сярэдзіне (асабліва часта) ці ў канцы сказа. Пры гэтым у склад параўнання класік нярэдка ўключае адно слова, найчасцей назоўнік ці прыметнік:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Заўсёды смутныя, бы ўдовы // Яны* [елкі – А.М.] *найбольш адны стаялі, // І так маркотна пазіралі // Іх задуменныя галовы* [1, с.5]; *Міхал з Антосем, як старыя, // Займалі месцы канцавыя // І іх трымаліся выключна, // Бо тут сядзець ім больш спадручна* [1, с.18]. Нярэдкія і параўнальныя звароты, што ўяўляюць сабой спалучэнні слоў або даданыя часткі складаназалежнага сказа: *Растуць снапочкі самавіта, // Стаяць, // Бы лялечкі якія, // Глядзяць, як госці дарагія* [ 1,с.23]; *Прыветна вокны пазіраюць, // Бы вас у госці запрашаюць* [1, с.68]. Майстэрства Якуба Коласа праявілася і ў частым ужыванні вобразных параўнальных зваротаў, якія характарызуюць прадмет у пераносным значэнні праз супастаўленне пэўнай з'явы ці прадмета з іншай з'явай ці прадметам на аснове агульных для іх адзнак і ўласцівасцей: *І соку кропелькі, як слёзы, // Як град, пасыпалісь з бярозы* [1, с.52].

Бяззлучнікавыя параўнанні выражаюцца назоўнікамі ў форме творнага склону: *Салома кудламі вісела, // Яе вятры параздзімалі, // А трохі хлопцы пасцягалі* [1, с.9].

Па спосабе марфалагічнага выражэння інтэгральнай прыметы параўнанні падзяляюцца на дзеяслоўныя, прыметнікавыя, прыслоўныя і назоўнікавыя. Найбольшае пашырэнне ў паэме Якуба Коласа «Новая зямля» атрымалі дзеяслоўныя параўнанні – параўнанні, што паясняюць дзеяслоў: *Тут човен раптам як рванецца, // Бы той спалоханы шчупак* [1, с.85]. Пры гэтым дзеяслоўныя параўнанні найчасцей адносяцца да семантычнай групы « Стан, прымета стану». Напрыклад, у сказе *А, ты ўжо тут! тырчыць, як паля!// Здароў, як маешся, Міхале?* [1, с.181] параўнанне *як паля* паясняе значэнне дзеяслова-выказніка *тырчыць* са значэннем прыметы стану.

Аснову дзеяслоўных параўнанняў семантычнай групы « Стан, прымета стану» складаюць назоўнікі (адзінкавыя ці ў спалучэнні з іншымі часцінамі мовы) з рознай семантыкай. Атрымалі пашырэнне параўнанні-назоўнікі са значэннямі «Асоба, жывая істота», «Аб'екты жывёльнага і расліннага свету», « Прадметы». Напрыклад: *Ды між верб ліпка маладая, // Бы іх унучка дарагая* [1, с.200]; *Растуць снапочкі самавіта, // Стаяць, // Бы лялечкі якія, // Глядзяць, як госці дарагія* [1, с.206]; *Бярозу добрую шукае, // З салодкім сокам, баравую, // Дзе б бобам кропелькі сачыліс*ь [1, с.52]. Варта адзначыць, што даволі часта ў ролі назоўніка з такім значэннем выступае лексема «Бог» : *Шукае дзядзька наш, як бога, // Ў людской галдзе гарадовага* [с.238]. Атрымалі пашырэнне ў паэме і параўнанні-назоўнікі, што называюць заамарфізмы (аб'екты жывёльнага свету). Напрыклад, у сказах 1. «*Зайцы* » *сярдзіта мітусяцца, // Яны даўно ўжо там стаялі, // Як мышы з норак, выглядалі* [1, с.230]. 2. *Так і ускіпіць, як рак чырвоны,- // Такі ён* [ляснічы –

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

А.М.] *кручаны, шалёны* [1, с.181] параўнаннямі выступаюць заамарфізмы *мышы, рак.*

Нярэдка ў якасці параўнанняў дадзенай семантычнай групы ўжываюцца назоўнікі – назвы прыродных з'яў і аб'ектаў, напрыклад сонца, град: 1. *А дзядзька быў рыбак заўзяты, // Рыбак у ім тут абудзіўся, // Як сонца, твар яго свяціўся* [1,с.209]. 2. *І соку кропелькі, як слёзы, як град, пасыпаліс з бярозы* [1, с.52].

У семантычным плане дзеяслоўныя параўнанні прадстаўлены ў паэме Якуба Коласа і з семантычнай групай « Дзеянне, працэс». Яны выяўляюць дзеянні, працэсы, звязаныя з актыўнасцю чалавека сельскагаспадарчай працы. Напрыклад, пры апісанні жніва аўтар ужывае багаты вобразнымі сродкамі сказ *Або калі над галавою // У жнейкі спрытнаю рукою рукою // Пучок калоссяў мільгатнецца, // Апіша дужку, бы вясёлку, // Бы нейкай znічкай след пагаслы* [1, с.205].

Да дзеяслоўных параўнанняў адносяцца і параўнанні (даданыя часткі складаназалежнага сказа), якія абазначаюць дзеянне**.** Напрыклад: *І гасне дзень у задуменні, // Як гаснуць жыцця летуценні* [1, с.200]. Дзеяслоўныя параўнанні, ужытыя ў паэме Якуба Коласа, могуць уключаць і групу слоў з семантыкай «Зрокавыя і слыхавыя асацыяцыі» і характарызуюць суб'екты жывой і нежывой прыроды. Напрыклад, у сказе *Зірнеш і страчваешся ты: // Сядзяць грыбы, як капыты, // І, разгарнуўшы парасоны, // Глядзяць, бы нейкія персоны* [1, с.209] дзеяслоў-выказнік *глядзець* (зрокавая асацыяцыя) паясняецца канструкцыяй *бы нейкія персоны*. Як правіла, такія канструкцыі маюць значэнне асобы, выражанай агульным адушаўлёным назоўнікам у спалучэнні з іншымі часцінамі мовы: 1. *А ў люстры водаў гэтай рэчкі, // Як закаханая дзяўчына, // Глядзіцца пышная вярбіна* [1, с.197]. 2. *– Ну, даволі! - // Сказаў Антось, і ўсе ўздыхнулі, // Як бы гару з плячэй сапхнулі* [1, с.54].

У паэме «Новая зямля» маюць месца і прыметнікавыя параўнанні, якія паясняюць прыметнік у асноўнай частцы. Атрымалі пашырэнне прыметнікавыя параўнанні семантычнай групы «Фізічныя, псіхічныя і душэўныя якасці чалавека». Як правіла, яны перадаюць душэўны стан чалавека. Напрыклад, гэта выяўляецца ў перадачы цяжкага душэўнага неспакою Міхала ў сказе *Міхал ідзе адзін, пануры, // І сам ён хмур, а думкі хмуры, // Як гэты лес, снягамі сцяты // Або замоўлены, закляты* [1, с.177]. У склад такіх параўнанняў уваходзяць звычайна назоўнікі ў спалучэнні з іншымі часцінамі мовы (напрыклад: *Вы жывы кожную часіну, // То задуменны, смутна строгі, як след захованай трывогі, // То поўны чараў спадзявання, // То страхаў цёмнага знікання, Калі душа свой лёс пачуе, І ноч нябыту зацянюе* [1, с.223]).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вылучаюцца і прыметнікавыя параўнанні семантычнай групы «Колер, яго адценні». У іх выяўляюцца асаблівасці колеру (яго адценняў) прыродных з'яў, аб'ектаў, прадметаў, а таксама пры мастацкім апісанні знешнасці чалавека, жывых істот. Інтэгральную аснову параўнання складаюць пераважна словы *белы, чорны*: *Так многа іх* [грыбоў. – А.М.]*, і ўсе таўсматы, // Прыземісты, карэнкаваты, // Чорнагаловы, паўнацелы, // Як тонкі кужаль, знізу белы* [1, с.209]. Ужываюцца і прыметнікавыя параўнанні семантычнай групы «Якасці і ўласцівасці, якія ўспрымаюцца органамі пачуццяў». Яны выяўляюць якасці і ўласцівасці разнастайных прыродных з'яў і аб'ектаў, прадметаў і рэчываў, што ўспрымаюцца органамі пачуццяў чалавека. У творы Якуба Коласа ўжываюцца такія параўнанні, якія звязаны са зрокавым успрыманнем і якія адлюстроўваюць або рост чалавека (напрыклад*: І трэці пан, даўгі, як дзіда, // Быў пан Кржывіцкі, равізовы, // Яшчэ нябачаны тут, новы* [1, с.182 – 183]) або яго вагу (напрыклад: *Яна ж, як гліна, надта цяжка, // Пад ёю крэкча каламажка* [1, с.154]).

Прыслоўныя параўнанні характарызуюць прыметы дзеяння, звязаныя з дзейнасцю чалавека. Напрыклад, у сказе *І ўсё вітала іх прыветна, // Бы тая блізкая радня* [1,с.206] параўнанне *бы тая блізкая радня* паясняе прыслоўе *прыветна*, што яшчэ раз паказвае на добразычлівыя адносіны паміж блізкімі, роднымі людзьмі.

Прыслоўныя параўнанні могуць характарызаваць фізічныя дзеянні, працэсы; рух; фізічны і душэўны стан герояў. Акрамя таго, яны могуць характарызаваць прыметы дзеяння, звязаныя са стыхійнай актыўнасцю прыродных з'яў, з рухам транспартных сродкаў, а таксама слыхавымі асацыяцыямі. У паэме Якуба Коласа найбольшае пашырэнне атрымалі згаданыя канструкцыі, дзе прыслоўныя параўнанні перадаюць душэўны і псіхічны стан асобы: 1. *І песціць шчыра ўсіх, як матка… // Хіба забудзеш міг той, братка?* [1, с.207]. 2. *Сярпок скрыгоча прагавіта, // Жытцо згразаючы сярдзіта, // Як бы яму ўсё мала стравы* [1, с.205]. Варта адзначыць, што нярэдка ў такіх выпадках назіраецца ўжыванне дзеясловаў і прыслоўяў у пераносным значэнні. Мае месца і ўжыванне прыслоўных параўнанняў, якія перадаюць фізічнае дзеянне або рух, перамяшчэнне. Напрыклад: *У зубы клёцку, бы ў ляшчоткі, // Заціснуў дзядзька і губамі // Варушыць борзда, як, часамі, // Трусок ці зайчык над капустай, // Каб лепш дазнацца смаку-густу* [1, с.55].

Сустракаюцца ў паэме і прыслоўныя параўнанні, у якіх вядзецца параўнанне з прыслоўямі, што ўжываюцца пры дзеясловах са значэннем слыхавой ці зрокавай асацыяцыі. Напрыклад, у сказе *А ўсюды ціха, нема, глуха, // І толькі заедзь каля вуха, // Гудзе агідна, надаедна, // Бы сама доля*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*наша бедна* [1. с.22] параўнанне *бы сама доля наша бедна* (якое, дарэчы, выразна паказвае цяжкае, непасільнае жыццё падняволенага чалавека) толькі ўзмацняе семантычнае адценне прыслоўяў *агідна, надаедна*, што ўжываюцца пры дзеяслове *гудзе* з семантыкай слыхавой асацыяцыі.

У паэме «Новая зямля» ўжываюцца і назоўнікавыя параўнанні – параўнанні, якія паясняюць у асноўнай частцы аб'ект ці суб'ект, выражаны назоўнікам. Напрыклад, у сказе *І гэтай думкай, як бы хваляй, // Падхвачан дзядзька, чэша далей // З узгорка ўніз, ізноў на ўзгорак, // Як бы па хвалях лёгкі корак* [1, с.226] параўнанне *як бы хваляй* паясняе назоўнік *думкай.* Назоўнікавымі параўнаннямі ў паэме звычайна выступае форма неадушаўлёных суб'ектаў, у першую чаргу прадметаў: *Парэчча – слаўная мясціна, // Куток прыгожы і вясёлы: // Як мора – лес, як неба – долы, // Зіхціць у кветках лугавіна…*[1, с.96]. Нярэдка такімі параўнаннямі характарызуюцца прадметы, звязаныя з сялянскім жыццём і побытам. Напрыклад, у сказе *Глядзі, брат, клёцка ўнь якая! // А брат ты мой, як булавешка, // Як скула тая, што ў Дзямешкі!* [1, с.55] праз параўнанне паказваецца аб'ём і, напэўна, смакавыя вартасці спрадвечнай беларускай стравы – клёцак. Варта адзначыць і яшчэ адну акалічнасць: звычайна ў якасці параўнання, каб падкрэсліць негатыўную характарыстыку суб'екта, выступаюць назоўнікі тыпу пан. Напрыклад: *А чыгунок, бы пан пузаты, // Кіпіць, пыхціць, шуміць заўзята* [1, с.54].

Назоўнікавыя параўнанні могуць уключаць назоўнікі, што называюць асобу: 1. *Як леснікі, яго падпаскі // Свае спаўнялі абавязкі, // Дзе і ў каго былі парубкі, // Каб мець прычыну дзеля ўзлупкі* [1, с.92]. 2. *Обер – аб'ездчыкам лічыўся, // Брахун не горшы ад сабакі* [1, с.91]. Такія назоўнікі, як правіла, выражаюцца агульнымі адушаўлёнымі назоўнікамі і сведчаць яшчэ раз пра добрае веданне аўтарам асаблівасцей жыцця і побыту сялян.

Такім чынам, праведзены аналіз мовы паэмы «Новая зямля» паказаў высокае майстэрства Якуба Коласа ў выкарыстанні выяўленчых сродкаў, у прыватнасці канструкцый з параўнаннямі, якія могуць абазначаць прадметы, асоб, фізічныя дзеянні і г.д. і выконваюць важныя стылістычныя функцыі, што садзейнічае рэалізацыі аўтарскай задумы.

## Літаратура

1. Колас, Я. Новая зямля. Сымон-музыка : Паэмы : Для сярэд. і ст. шк. узросту / Маст. Г.В.Шапялевіч / Я.Колас. - Мінск: Юнацтва, 1998. – 447 с., [1] л., партр., іл.
2. Навуменка, І.Я. Якуб Колас: Духоўны воблік героя. 2-е выд, дап. і перапрац. / І.Я. Навуменка. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1981. – 240 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ